Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1 (112), 2019

УДК 811.161.3'42'367.623:398.8(=161.3)

Аб ролі ад'ектываў у экспрэсівізацыі паэтычнага кантэксту беларускай народнай пазаабрадавай лірыкі

К.Л. Хазанава

Даследуюцца выражаныя рознымі формамі прыметнікаў мастацкія азначэнні, выяўленыя ў беларускіх народных пазаабрадавых песнях. У творах сустракаюцца кароткія і ўсечаныя формы прыметнікаў, ад'ектыўныя колераабазначэнні. Эпітэты ўжываюцца ў прэпазіцыі і ў постпазіцыі адносна азначаемага слова. Пашыраны дэмінутыўныя прыметнікі. Выкарыстанне розных прыметнікавых формаў у функцыі эпітэтаў спрыяе экспрэсівізацыі народна-паэтычнага пазаабрадавага дыскурсу, стварае эмацыянальнасць і вобразнасць пазаабрадавай беларускай народнай паэзіі.
Ключавыя словы: эпітэт, прыметнік, экспрэсіўнасць, пазаабрадавы фальклор, азначэнне, колер, метафара.

The artistic definitions expressed by various forms of adjectives and presented in Belarusian folk extra-regular songs are investigated. In the works there are short and truncated forms of adjectives, adjectival color designations. Epithets are used in the preposition and in the postposition regarding the designated word. The use of diminutive adjectives is expanded. The use of various forms of adjectives in the function of epithets contributes to the expression of the popular poetic extra-sacred discourse, creates emotionality and imagery of extra-ceremonial Belarusian folk poetry.
Keywords: epithet, adjective, expressiveness, non-ritual folklore, definition, color, metaphor.

Беларускі народна-паэтычны пазаабрадавы дыскурс з'яўляецца неад'емнай і арганічнай часткай духоўнай скарбніцы народа. Творы пазаабрадавай лірыкі не маюць дакладнай часавай або падзейнай арыентаванасці і выконваюцца «пад настрой» у любы дзень і час. Такая прызначанасць абумовіла тэматычна-жанравую разнастайнасць пазаабрадавых тэкстаў (песні пра цяжкую долю, пра каханне і сямейнае жыццё, пра службу ў войску, жартоўныя і сатырычныя песні), а таксама надзвычайную экспрэсіўнасць іх мовы.

Калі абрадавыя творы прымеркаваны да калядарных або сямейных падзей, што ўжо актывізуе ўвагу ўспрымальнікаў, то пазаабрадавыя творы не маюць гэтай папярэдняй падрыхтоўкі аўдыторыі. Пазаабрадавы тэкст сам па сабе выяўляе пэўнае лірычнае пераўвасабленне рэчаіснасці, адлюстраванне пэўнай жыццёвай сітуацыі, прапушчанай скрозь паэтычнае мысленне стваральнікаў народнага тэксту, за кошт чаго экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць народна-паэтычнага пазаабрадавага дыскурсу надзвычай канцэнтраваная.

Экспрэсівізацыі пазабарадавых фальклорных твораў спрыяе наяўнасць у тэкстах разнастайных моўных сродкаў. Увагу прыцягваюць вобразна-выяўленчыя сродкі мовы пазаабрадавых тэкстаў. Сярод тропаў назіральна колькасна пераважаюць мастацкія азначэнні. Ва ўмовах народна-паэтычнага дыскурсу надзвычайную выразнасць набываюць шматлікія азначэнні, якія ў тэкстах іншай жанрава-стылістычнай накіраванасці не будуць вызначацца як вобразныя. Многія ад'ектывы ў лінгвістычным кантэксце фальклорнага твора набываюць вобразнасць і становяцца эпітэтамі.

Мэта артыкула – характарыстыка ролі прыметнікаў-эпітэтаў у экспрэсівізацыі мовы беларускіх народных пазаабрадавых тэстаў.

Спецыфіка ўжывання мастацкіх азначэнняў у беларускіх народных пазаабрадавых тэкстах праяўляецца ў тым, што інтэнсіўнасць насычэння эпітэтамі твора звязана з жанрава-тэматычнай вызначанасцю. Эпітэты перапаўняюць песні пра цяжкую долю:

Ой, асіна ***вілаватая****, Не шумі ты нада міной* [1, с. 22];

Я й малада схілілася, ***Дробнай*** *слёзкай залілася* [1, с. 23].

У песнях нядолі і змагання (тэрмін, прапанаваны Н. Гілевічам [1]) амаль не ўжываюцца адзінкавыя эпітэты. Як правіла, тэкст прапануе некалькі мастацкіх азначэнняў:

Вылецела ластаўка з-пад ***яснай*** *зары,*
Прыехала сястра к братцу з ***чужой*** *стараны* [1, с. 25];

Ой, ***глыбокія*** *ды калодзісі,* ***Кароткія*** *ключы* [1, с. 20].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Заканамерна, што ў беларускіх народных пазаабрадавых песнях часта выкарыстоўваюцца сталыя мастацкія азначэнні. Гэтыя вобразна-выяўленчыя сродкі праз шматразовае ўжыванне ў фальклорных тэкстах ужо замацаваліся ў народнай свядомасці ў спалучэнні з адпаведным азначаемым словам:

Вылецела ластаўка з-пад ***яснай*** *зары, Прыехала сястра к брату з* ***чужой*** *стараны,*
А прыйшла ў хатачку, прывіталася, А пра ***дробных*** *дзетачак папыталася* [1, с. 22].

Такая спаянасць, аднак, не зніжае эмацыянальнасці і выразнасці моўных адзінак. Наадварот, веданне аўдыторыяй спалучэння ад'ектыва і назоўніка актуалізуе ўвагу, узмацняе ўспрыманне:

Каб была я ды ***шэрай*** *зязюлькаю Да каб умела лятаці*
Паляцела б на ***родну*** *староначку Сваю маці шукаці* [1, с. 21];
Ужо ж на дварэ не ранюсенька – ***Краснай*** *дзеўкі з церама няма* [1, с. 32].

Устойлівасць традыцыі выкарыстання ў фальклорных твораў пастаянных спалучэнняў *прыметнік + назоўнік* выражаецца ў пазаабрадавай лірыцы ў частотнасці колеравых эпітэтаў. Менавіта традыцыйнасць выкарыстання пэўнага колераабазначэння з адпаведным субстантывам стварае своеасаблівую вобразнасць выяўленчага кантэксту.

Мора ў песнях чакана *сіняе*: *Затапіла галовачку На дно* ***сіня*** *мора* [1, с. 37].

Прыметнік *шэры* звычайна азначае назвы птушак:

А не нашла а ***шэрая*** *пава Сваіх дробных дзетак* [1, с. 31];
Скуль ўзялася ***шэрая*** *зязюля, Стала кукаваці* [1, с. 51].

Прыметнік *сівы* часта ўжываецца ў функцыі азначэння назвы дамашняй жывёлы, што выкарыстоўваецца ў гаспадарцы: *Запрагу я* ***сівы*** *валэ, Паеду ў поле араць* [1, с. 36].

Асобныя колеравыя намінацыі адзначаюцца разнастайнасцю прымеркаванасці да азначаемых аб'ектаў:

Пад ***белаю*** *бярозаю Стаіць браток з сястрыцаю* [1, с. 21];
Як спаймалі, так і ўзялі Пад ***белыя*** *рукі* [1, с. 39];
А з-пад гаю з-пад ***зялёнага*** *Выходзіла туча чорная* [1, с. 31];
Ой, дубе мой, дубе, Дубочак мой ***зялёненькі*** [1, с. 37];
Паіце сястру ***зялёным*** *віном* [1, с. 16].

Пазаабрадавыя тэксты прапануюць іншы раз не зусім чаканае колеравае вызначэнне: ***Чырвона*** *каліна ў лузе схілілася, А я, маладая, зжурылася* [1, с. 35]. Тут экспрэсіўнасць дасягаецца праз акцэнтаванне ўвагі аўдыторыі на падставах выкарыстання дадзенага колеравага наймення: успрыманне дрэва ў такой колеравай гаме абумоўлена колерам яго пладоў.

Часта ў беларускіх пазаабрадавых тэкстах ужываецца некалькі колеравых прыметнікаў:

У ***цёмным*** *лесе грыбы зарадзілі, Там дзяўчаты па грыбы хадзілі.*
Адна дзеўка па грыбы хадзіла. Прыбледзіла к ***зялёнаму*** *дубу*
Ды сказала: – «Начаваць тут буду». Я думала, што дуб ***зеляненькі,***
Ажно стаіць хлопец ***маладзенькі*** [1, с. 106].

Пры гэтым выкарыстанне некалькіх колераабазначэнняў спалучаецца з ужываннем эпітэтаў, якія вобразна характарызуюць іншыя якасці:

А з-пад лесу, лесу ***цёмнага****, а з-пад гаю з-пад* ***зялёнага*** *Выходзіла туча* ***чорная***
Да ***чорная, неспакойная****, І* ***грамлівая****, й* ***даждлівая*** [1, с. 31].

Ад'ектыўныя назвы колераў у пазабрадавай лірыцы могуць мець стылістычную функцыю актуалізацыі ўвагі аўдыторыі праз зварот да кантрастаў:

Маеш ручкі, ножкі, ***Светленькія*** *вочкі –*
Будзеш ты рабіці Да ***цямненькай*** *ночкі* [1, с. 28].

Яскравая марфалагічная адметнасць эпітэтаў-ад'ектываў, адзначаных у мове беларускай пазаабрадавай лірыкі – кароткія формы прыметнікаў:

– Бярыце, служкі, за ***белы*** *ручкі, Вядзіце, служкі, яе да пакоя* [1, с. 16].

З гісторыі ўсходнеславянскіх моў вядома, што кароткія формы прыметнікаў больш раннія за поўныя. Для сучаснай беларускай мовы кароткія прыметнікі не з'яўляюцца ўласцівымі. І фальклорныя творы захавалі са старажытнасці кароткія прыметнікі, даючы сучаснай аўдыторыі ўяўленні пра асобныя граматычныя формы мовы мінулых эпох. У асобных тэкстах адзначаюцца спецыфічныя кароткія формы, поўных адпаведнікаў якіх не захавалася ў сучасных усходнеславянскіх мовах або, магчыма, кароткая форма страцілася яшчэ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

да часоў утварэння поўных прыметнікаў. У старажытнарускай мове ўжываўся прыметнік *буи* ‘храбры, адважны, моцны’. У функцыі эпітэта лексема *буи (буй)* выкарыстана ў «Слове пра паход Ігаравы»: ***буй*** *тур Всеволодъ* [2, с. 29], ***буй*** *Рюриче* [2, с. 41]. У сучаснай беларускай мове ўжываецца вытворны ад старажытнарускага *буи* прыметнік *буйны*, які пашырыў семантыку і мае намінатыўна-першаснае значэнне ‘вялікі па памерах’, ‘значны’. Пазаабрадавыя тэксты характарызуюцца захаваннем старажытных кароткіх формаў прыметніка *буйны*:

У чыстым полі ***буён*** *ветрык веець* [1, с. 25].

Ад кароткіх прыметнікаў неабходна адрозніць беларускую граматычную спецыфічную адметнасць – сцягнутыя, або ўсечаныя, прыметнікавыя формы. Сцягнутыя прыметнікі ўтварыліся ад поўных формаў праз выпадзенне [j] і сцяжэнне (усячэнне) дзвюх аднолькавых галосных. Асаблівасці развіцця спрыялі захаванню ўсечаных прыметнікаў толькі ў асобных граматычных формах: назоўны і вінавальны склоны адзіночнага ліку жаночага роду і назоўны склон адзіночнага ліку ніякага роду. Гэтыя формы дастаткова пашыраны ў пазаабрадавых беларускіх тэкстах:

А не нашла ***малада*** *сіротка Сваёй роднай мамкі.*

Толькі нашла ***глыбоку*** *крыніцу,* ***Сцюдзёну*** *вадзіцу:*

– Скалыхніся, ***глыбока*** *крыніца,* ***Сцюдзёна*** *вадзіца* [1, с. 31];

– Ой вы, дзеці мае, дзеці, А дзе ж ваша ***родна*** *маці?* [1, с. 29].

Азначэнні, выражаныя кароткімі і ўсечанымі формамі прыметнікаў, валодаюць своеасаблівай эмацыянальнасцю і экспрэсіўнай насычанасцю. Гістарычны каларыт гэтых ад’ектываў узмацняе іх мастацкасць і робіць гэтыя прыметнікі мастацкімі азначэннямі.

Выразнасці пазаабрадавых песень беларусаў садзейнічаюць сінанімічныя эпітэты-ад’ектывы, выкарыстанне якіх суправаджаецца часта паўтарэннем аднаго з іх. Паўторы могуць быць дыстантныя, а паўтораныя эпітэты адносіцца да розных азначаемых слоў:

Сястра да брата ў госці едзіць. Ды ці не тая, што ***гарутная,***

На ***благім*** *конічку, ў* ***благім*** *вазочку?* [1, с. 15].

Стылістычны прыём спалучэння сінанімічных эпітэтаў з паўтарэннем можа ўтрымліваць і кантактны паўтор постпазіцыйнага прыметніка, прычым ад’ектывы азначаюць адзін і той самы назоўнік:

Едзе сястра ***бяздольная, Бяздольная, галодная*** [1, с. 17].

Прыведзены фактычны матэрыял паказвае разнастайнасць становішча эпітэтаў адносна азначаемага слова ў беларускіх пазаабрадавых тэкстах. Постпазіцыйнае размяшчэнне даволі характэрна для эпітэтаў-прыметнікаў у мове пазаабрадавай лірыкі:

Запрагу я валы ***крутарогі*** *Ды паеду араць край дарогі*

Ды наару я поля ***шырокага****, Ды пасею я хмелю* ***высокага,***

Да нажану ж я піва ***салодкага*** *Ды для свайго роду* ***далёкага,***

Ды й для бацькі і мамачкі, Ды й для сястрыцы ***багатай*** [1, с. 15];

Прысніўся мне сон ***дзіўненькі****, што памёр мой брат* ***радненькі*** [1, с. 18].

Сустракаецца і прэпазіцыйнае выкарыстанне мастацкіх азначэнняў-ад’ектываў:

А ў ***роўным*** *полюшку Стаяла каліначка* [1, с. 29];

Прыхаджу я ка дварочку, К ***высокаму*** *церамочку* [1, с. 29];

Ля ***крутога*** *беражочку – Тама браццы сена косяць* [1, с. 29].

Адным са спосабаў стварэння экспрэсіўнасці паэтычнага кантэксту ў пазаабрадавых песенных тэкстах становіцца ўжыванне ў функцыі мастацкіх азначэнняў формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў:

Ой, маю слоўца ***найвярнейшае****, Што з ім гаварыць* [1, с. 26].

Адметнае выкарыстанне ў пазаабрадавых тэкстах набывае спалучэнне прыметніка з суплетыўнай формай вышэйшай ступені параўнання таго самага прыметніка. Выразнасць тэксту ўзманяецца за кошт ужывання ад’ектыўных формаў з рознымі азначаемымі словамі, што стварае своеасаблівую градацыю выражэння прыметы, названай прыметнікавымі формамі: *Ой, палын, палын – трава* ***горкая****, А доля мая – яшчэ* ***горшая*** [1, с. 33].

Марфемна-словаўтваральная структура ад’ектываў таксама ўплывае на павышэнне выразнасці і эмацыянальнасці твора. Насычанасць дэмінутыўнымі формамі фальклорных твораў увогуле не магла не адлюстравацца ў пазаабрадавай лірыцы:

Сеець яна да ***позненькай*** *ночкі, Выплакала свае ясны вочкі* [1, с. 25];

Панічок ***малодзенькі*** *Словамі прыяцен* [1, с. 37];

У ***сцюдзёненькай*** *крынічаньцы Там сіротка ваду чэрпала* [1, с. 32].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У пазаабрадавых тэкстах адзначаецца неаднаразовае ўжыванне памяншальна-ласкальных формаў прыметнікаў у спалучэнні з паўтарэннем адной з іх, што актуалізуе ўвагу аўдыторыі і садзейнічае павышанай эмацыянальнасці радкоў. Пры гэтым паўтораны дэмінутыўны эпітэт выкарыстоўваецца з рознымі азначаемымі словамі:

Пайду я ў ***вішнёвенькі*** *садок, Ёсць у садзе* ***цукровенькі*** *гарох –*

Я кінуся свайму брацейку да ног. Ёсць у садзе ***цукровенькі*** *аграст* [1, с. 16].

Для пазаабрадавых паэтычных тэкстаў уласціва не толькі выкарыстанне сталых пастаянных эпітэтаў-прыметнікаў. Некаторыя мастацкія азначэнні характарызуюцца індывідуальна-аўтарскім падыходам і нясуць адбітак індывідуальнага майстэрства асобных стваральнікаў фальклорных твораў:

З бору ***гаманлівага*** *Рэчанька цякла* [1, с. 32];

Карміце ***сытым*** *пірагом* [1, с. 16].

Назіранне за моўна-стылістычнымі рысамі беларускай народнай пазаабрадавай лірыкі выяўляе неаднароднасць выкарыстання прыметнікавых эпітэтаў у розных жанрава-тэматычных групах пазаабрадавых твораў. Вышэйназваныя спосабы экспрэсівізацыі народна-паэтычнага кантэксту праз ужыванне ад’ектываў былі зафіксаваныя ў сацыяльна-бытавых песнях. У песнях пра каханне мастацкія азначэнні-прыметнікі распаўсюджаны менш:

Мой міленькі, едз дадому – На ***цёплую*** *вячэраньку, На* ***белую*** *пасцеляньку:*

Вячэранька ***мядовая****, Пасцель* ***бела пуховая*** [1, с. 97].

У песнях пра каханне адзначаюцца сталыя эпітэты-найменні колераў:

Чые гэта ***шэры*** *валы Па гарах хадзілі?* [1, с. 98];

А ты, ***шызанькі*** *саколік, Што ты ў сад не лятаеш* [1, с. 100];

Чаравала ручкі, ножкі, Шчэ ***карыя*** *вочкі,*

Што ж не хадзіў да другея ***Цёмненькаю*** *ночкай* [1, с. 101].

У сатырычных і жартоўных песнях эпітэты таксама сустракаюцца не настолькі часта, як у сацыяльна-бытавых тэкстах, аднак становяцца складнікамі супрацьпастаўлення і ствараюць вобразны паралелізм:

– Ты, бяроза ***кудрава****, Як табе не здакучыла,*

– За ***сухім*** *лесам стоячы, На* ***зялёненькі*** *гледзячы?*

Маладзіца ***маладая****, Як табе не здакучыла,*

За ***благім*** *мужам жывучы, На* ***харошых*** *гледзячы?* [1, с. 309].

Праведзенае даследаванне стылістычных адметнасцей выкарыстання ад’ектываў у беларускіх народна-паэтычных пазаабрадавых творах паказвае дастаткова вялікую колькасную насычанасць песень, асабліва сацыяльна-бытавых, прыметнікавымі формамі. Старажытнасць узнікнення і трывалае функцыянаванне пазаабрадавай лірыкі паўплывала на ўжыванне ў тэкстах прыметнікавых формаў, што амаль не ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове. Замацаванасць і ўстойлівасць выкарыстання асобных прыметнікаў з адпаведнымі азначаемымі словамі стварае іх вобразнасць і мастацкасць, з прычыны чаго шматлікія прыметнікавыя формы ў пазаабрадавай лірыцы становяцца эпітэтамі. Часта ў пазаабарадавых песнях сустракаюцца кароткія і ўсечаныя формы прыметнікаў, ад’ектыўныя колераабазначэнні. Эпітэты ўжываюцца як у прэпазіцыі, так і ў постпазіцыі адносна азначаемага слова. Пашыраны таксама дэмінутыўныя прыметнікі. Выкарыстанне разнастайных прыметнікавых формаў у функцыі мастацкіх азначэнняў спрыяе экспрэсівізацыі народна-паэтычнага пазаабрадавага дыскурсу, стварае эмацыянальнасць і вобразнасць пазаабрадавай беларускай народнай паэзіі.

Літаратура

1. Лірычныя песні / Укладанне і рэд. Н.С. Гілевіча. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – 464 с.

2. Слово о плъку Игоревѣ , Игоря, сына Святъславля, внука Ольгова // Слово о полку Игореве. – М. : Художественная литература, 1987. – С. 26–52.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 13.06.2018

ГОМЕЛЬСКИЙ ГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ